ПАДАРУНКІ АД «ЗВЯЗДЫ» **4**

ЛІЧБАВЫЯ НАВІНЫ ЕАЭС

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

16 КРАСАВІКА 2019 г. АЎТОРАК № 71 (28938)

ЦЫТАТА ДНЯ

Міхаіл МІХАДЗЮК, намеснік міністра энергетыкі Беларусі:

«Фізічны пуск першага энергаблока Беларускай АЭС запланаваны на восень 2019 года. Мы ідзём да гэтага, рыхтуемся, але яшчэ трэба прайсці шэраг этапаў. Зараз мы знаходзімся на этапе індывідуальнага апрабавання абсталявання, наступны этап — гідравыпрабаванні, цыркпрамыўка, халодная і гарачая абкатка. Пасля гэтага рэвізія абсталявання. Калі на стадыі абкатак не будзе форс-мажораў, восенню мы павінны пайсці на фізічны пуск. Прыкладаем усе намаганні, каб сёлета блок уключыць у работу. Што датычыцца завозу на пляцоўку Беларускай АЭС ядзернага паліва, то гэта не самамэта. Калі завязём паліва, у нас зусім іншы рэжым работ на станцыі будзе — у плане забеспячэння фізічнай абароны і іншага. Таму мы з гэтай справай не спяшаемся».

КАРАТКА

• Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з 70-годдзем Алу Пугачову.

• У Мінску да 1 мая цалкам заменяць пакрыццё на транспартных калідорах II Еўрапейскіх гульняў.

• У Ізраілі навукоўцы ўпершыню надрукавалі жывое чалавечае сэрца на 3D-прынтары.

• У Вялікабрытаніі дзеці і падлеткі да 18 гадоў будуць пазбаўленыя магчымасці ставіць лайкі ў сацсетках.

• Па факце траўміравання салдата тэрміновай службы ў Мінску распачата крымінальная справа.

ISSN 1990 - 763X

УЗРОВЕНЬ ГАТОЎНАСЦІ — ВЫСОКІ

Фота БелТА.

Учора кіраўнік дзяржавы як Прэзідэнт Нацыянальнага алімпійскага камітэта прыняў удзел у пасяджэнні Выканкама НАК Беларусі. Безумоўна, цэнтральнай тэмай сустрэчы стала падрыхтоўка да II Еўрапейскіх гульняў, аднак закранулі і дзейнасць самога камітэта, і яго кадравы склад.

Пра арганізацыю

«Як вядома, НАК займае асаблівае месца ў сістэме фізічнай культуры і спорту. Сярод найважнейшых кірункаў яго работы — развіццё алімпійскага руху ў цесным узаемадзеянні з дзяржаўнымі органамі і мясцовымі ўладамі, каардынацыя дзейнасці рэспубліканскіх федэрацый па відах спорту», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем адзначыў, што апошнім часам НАК некалькі збавіў абароты. «Калі раней у гэтым будынку кіпела жыццё, праводзіліся рэзанансныя мерапрыемствы па алімпійскай адукацыі, падтрымцы дзіцяча-юнацкага спорту, то цяпер гэтай работы амаль не відаць і не чуваць. Павеяла нейкім холадам у адносінах з федэрацыямі, гэта дрэнна, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Важна, каб менавіта НАК быў цэнтрам прыцягнення для спартсменаў, трэнераў, нашых славутых чэмпіёнаў, падрастаючага пакалення. Гэта і іх дом таксама».

СТАР. 2

Шпацыр на колах

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

У сталічным Лошыцкім парку.

Тэхналогіі

ПАЎМІЛЬЁНА СОСНАЎ НА ШАСЦІ СОТКАХ

У Іўеўскім гадавальніку хвойныя саджанцы вырошчваюць паскораным метадам

У гэтым сезоне плануецца ўзнавіць каля 300 гектараў лясных культур, што на 100 гектараў больш, чым летась. Асноўная ўвага ў лясгасе аддаецца хвойным пасадкам, якія значна пацярпелі ад засухі і лясных караедаў. Каб паскорыць рост саджанцаў, іх пачалі вырошчваць у цяпліцах. Пасадачнага матэрыялу цяпер хапае не толькі для свайго раёна, але і для іншых.

Такіх цяпліц у гадавальніку Іўеўскага лясгаса некалькі. На выгляд саджанцы нагадваюць суцэльны зялёны дыван з пушыстым ворсам. Так яно і ёсць. Бо маленькія елачкі і хвойкі вельмі далікатныя і мяккія.

СТАР. 13

УЗРОВЕНЬ ГАТОЎНАСЦІ — ВЫСОКІ

Пра падрыхтоўку да Еўрапейскіх гульняў

«Але сёння мы павінны разгледзець пытанні гатоўнасці краіны і нашых спартсменаў да II Еўрапейскіх гульняў, да гэтай маштабнай спартыўнай падзеі, — падкрэсліў Прэзідэнт. — Яна, безумоўна, стане найважнейшым грамадска-палітычным мерапрыемствам у гісторыі суверэннай Беларусі».

Паводле яго слоў, да нашай краіны ў гэтыя дні будзе прыкавана пільная ўвага сусветнай супольнасці. Задача — не толькі правесці Гульні на самым высокім узроўні, але і чарговы раз паказаць, што на нашай зямлі створаны камфортныя і, што немалаважна, бяспечныя ўмовы для жыцця і самарэалізацыі чалавека.

Таксама кіраўнік дзяржавы нагадаў, што для падрыхтоўкі Гульняў створаны аргкамітэт на чале з прэм'ер-міністрам, выдзяляюцца неабходныя фінансавыя сродкі.

«Спартыўныя аб'екты, тэлекамунікацыі, дарожная сетка, пасажырскі транспарт, студэнцкая вёска — усё павінна адпавядаць самым высокім стандартам. Як мне дакладваюць, пытанні вырашаюцца, і вырашаюцца аператыўна. Мадэрнізацыя задзейнічанай інфраструктуры ідзе па плане, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Разам з тым хацелася б на гэтую тэму сёння пагаварыць прадметна для таго, каб, магчыма, больш не вяртацца да яе да пачатку Гульняў».

Прэзідэнт НАК чакае канкрэтных прапаноў па ўсіх незавершаных будоўлях, закупках інвентару і абсталявання, прыцягненні дадатковых сіл і сродкаў.

Акрамя таго, была пастаўлена задача жорстка кантраляваць выдаткі. Забяспечыць рацыянальнае выкарыстанне ўсяго абсталявання, што закупляецца, аўтапарка, пабудаваных аб'ектаў пасля завяршэння Гульняў. «Як выконваюцца патрабаванні, ці ёсць адпаведныя планы?» — спытаў Прэзідэнт.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Пра спартыўныя задачы для нашай зборнай

«Далей, да якога спартыўнага выніку мы імкнёмся? Медальныя планы на Гульні публічна не агучваліся, але задача стаіць канкрэтна: не менш, чым у Баку, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Мы спаборнічаем дома, на сваіх арэнах, пры роднай публіцы. Падтрымка ўсяго беларускага народа, зразумела, будзе забяспечана. Таму ў нас няма права выступаць на гэтых Гульнях дрэнна».

Кіраўнік дзяржавы заклікаў давесці гэта да спартсменаў і трэнераў, настройваць іх на барацьбу, нацэльваць на перамогу.

«І мы гэта можам. І апошні чэмпіянат Еўропы па цяжкай атлетыцы паказаў, што мы можам на роўных змагацца з вядучымі дзяржавамі нашай планеты. Ёсць і адваротны прыклад — наш біятлон. Грошы выдаткавалі немалыя, а што ён паказаў, вы таксама ведаеце. Тое ж самае, Сяргей Мікалаевіч [Румас, прэм'ер-міністр Беларусі. — **«Зв.»**], футбол. Тое ж самае — хакей, сур'ёзна давядзецца падумаць. Але гэта размова пасля чэмпіянату свету, у той групе, у якую мы з вамі зваліліся, у прыватнасці хакеісты. Па біятлоне мы яшчэ разбяромся і па іншых зімовых відах спорту. Трэба мець на ўвазе, што медалі — гэта не толькі спартыўны вынік. Гэта гонар і слава Радзімы», — дадаў ён.

Прэзідэнт падкрэсліў: спорт — гэта не проста нейкае забаўляльнае відовішча, гэта бітва, гэта вайна, толькі не гарачая.

Дарэчы, а як беларуская зборная выступіла на I Еўрапейскіх Гульнях 2015 года ў сталіцы Азербайджана — Баку? Тады наша дружына заваявала 43 медалі, у тым ліку 10 залатых, 11 сярэбраных і 22 бронзавыя. Каманда заняла 7-е месца ў неафіцыйным агульнакамандным заліку па вартасці медалёў.

Па дэталёвым плане

Як расказаў прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Румас, у цэлым краіна знаходзіцца ў высокай ступені гатоўнасці да правядзення Еўрапейскіх гульняў. Штотыдзень пад яго кіраўніцтвам праводзяцца пасяджэнні рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта, на якіх разглядаюцца актуальныя праблемныя пытанні, прымаюцца рашэнні.

На Гульнях будуць задзейнічаны 15 спартыўных аб'ектаў. Па кожным з іх рэалізуюцца дэталёвыя планы падрыхтоўкі. Цяпер заканчваецца ўзвядзенне часовай інфраструктуры, завяршаецца закупка неабходнага абсталявання. Задача — да 15 мая забяспечыць поўную гатоўнасць усіх аб'ектаў.

На спартыўных аб'ектах ужо праведзены тэставыя спаборніцтвы па 14 спартыўных дысцыплінах. Значных праблем не было выяўлена. З красавіка да пачатку чэрвеня будуць праведзены тэставыя спаборніцтвы яшчэ па 12 дысцыплінах у сямі відах спорту.

Практычна завершана распрацоўка інфармацыйна-тэхналагічнай платформы. Асобныя модулі сістэмы ўжо пратэсціраваныя, у маі будуць пратэставаныя ўсе сэрвісы.

Для заўзятараў і турыстаў з улікам ужо запланаванага размяшчэння спартсменаў будзе даступна каля сямі тысяч месцаў — не лічачы кватэр у арэнду. Вызначаны месцы пражывання ў Мінскай вобласці — даступна больш чым 18 тысяч месцаў у гасцініцах, санаторыях, аграсядзібах.

Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.

❍ У тэму

«Праблемныя пытанні ў падрыхтоўцы да Еўрапейскіх гульняў адсутнічаюць»

Па выніках пасяджэння прэм'ер-міністр Сяргей Румас пагутарыў з журналістамі.

Ён адзначыў, што кіраўнік дзяржавы падчас пасяджэння падрабязна спыніўся на гатоўнасці кожнага з 15 спартыўных аб'ектаў, якія прымуць Еўрапейскія гульні. Абмеркавалі пытанні харчавання, удзелу валанцёраў, размяшчэння афіцыйных асоб, спартсменаў.

Ён таксама звярнуў увагу, што ёсць яшчэ літаральна тры аб'екты, дзе трэба завяршыць апошнія рамонтныя моманты. «95 % абсталявання ўжо ўстаноўлена, вось гэтыя 5 % паступяюцца па графіку, але на 15 мая поўная гатоўнасць усіх аб'ектаў будзе забяспечана», — сказаў прэм'ер-міністр.

«Праблемныя пытанні ў падрыхтоўцы да Еўрагульняў адсутнічаюць», — падкрэсліў ён.

У ходзе буйных спартыўных мерапрыемстваў часта рэзка падскоквае кошт пражывання ў гасцініцах, таксама цэны падымаюць і людзі, якія здаюць кватэры ў арэнду. Як з гэтым змагаюцца?

«У Мінску нічога падобнага адбывацца не будзе. Сёння Дырэкцыя па правядзенні Еўрагульняў падпісала пагадненне з усімі буйнымі гатэлямі, якія будуць прымаць гасцей. І ў гэтых пагадненнях выразна зафіксавана, што цэны на перыяд гэтага маштабнага спартыўнага спаборніцтва падымацца не будуць», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

Сур'ёзнае пытанне — ці ўдаецца ўкласціся ў запланаваны бюджэт? «Мы знаходзімся ў рамках першапачаткова зацверджанага каштарыса. Больш за тое, мы адчуваем, што па прыцягненні спонсараў унутры краіны гэты артыкул даходаў перавыканаем», — адзначыў прэм'ер-міністр.

Так, актыўна ўключаюцца прыватныя арганізацыі, якія зацікаўлены ў рэкламе сваёй прадукцыі на Еўрагульнях. Што па знешніх спонсарах, то ці ёсць зрухі ў пазітыўны бок? «Не, па знешніх, на жаль, ЕАК [Еўрапейскія алімпійскія камітэты. — **«Зв.»**] падвёў нас і не змог прыцягнуць ні аднаго знешняга спонсара. Але мы кампенсуем гэта знешнімі спонсарамі ў тым ліку, якіх прыцягвае сёння Дырэкцыя. Вядома, на першапачатковыя лічбы мы не выйдзем. Калі б нам ЕАК даверыў гэтую работу за два гады, то, вядома, мы б змаглі прыцягнуць знешніх спонсараў на такое глабальнае спартыўнае спаборніцтва», — дадаў Сяргей Румас.

* * *

Акрамя таго, па выніках пасяджэння стала вядома, што абавязкі першага віцэ-прэзідэнта НАК будзе выконваць памочнік Прэзідэнта па нацыянальнай бяспецы Віктар Лукашэнка. Пытанні, якія замацаваны за ім: міжнароднае супрацоўніцтва, падрыхтоўка да буйных спартыўных мерапрыемстваў, у тым ліку — да II Еўрапейскіх гульняў і лёгкаатлетычнага матча Еўропа — Амерыка.

Калі нас паклічуць — мы гатовыя дапамагчы

На мінулым тыдні Аляксандр Лукашэнка даў інтэрв'ю турэцкаму інфармацыйнаму агенцтву «Анадолу». Мы пісалі пра гэта: тады беларускі лідар расказаў, што ўсе канфлікты камусьці патрэбныя, аднак Беларусь катэгарычна ў іх не зацікаўлена. Таксама ён выказаў здагадку, што прэзідэнцкія выбары ва Украіне выйграе Пётр Парашэнка. Цяпер інтэрв'ю стала даступна ў поўным выглядзе, таму публікуем самыя цікавыя моманты з яго.

Дарэчы, сёння Прэзідэнт здзяйсняе афіцыйны візіт у Турцыю. Акрамя перагаворaў з Прэзідэнтам Турцыі Рэджэпам Таіпам Эрдаганам, запланавана сустрэча дзелавых колаў абедзвюх краін.

Пра ўдзел Беларусі ва ўрэгуляванні канфлікту ва Украіне

Меркаванне кіраўніка дзяржавы па гэтым пытанні такое: зараз наша краіна робіць усё магчымае, каб унесці свой уклад ва ўрэгуляванне. Аднак, калі прэзідэнты Расіі і Украіны «будуць бачыць узмацненне ролі Беларусі там, то мы гатовыя выканаць гэтую ролю». Тым не менш навязвацца ў міратворцы самі мы не будзем. Паводле слоў беларускага лідара, канфлікт ва Украіне да гэтага часу аказвае небяспечны ўплыў на Беларусь.

Наша краіна спакойна ставіцца да аб'ектыўнай крытыкі Захаду

Больш за тое — мы ўмеем здабываць з яе ўрокі і вучыцца, упэўнены Аляксандр Лукашэнка. Паводле яго слоў, Захаду не падабаюцца многія тэндэнцыі, якія адбываліся і ў меншай ступені адбываюцца цяпер. Ён дадаў, што Беларусь вучыцца і ў сваіх усходніх суседзяў — Расіі і Кітая.

Прэзідэнт таксама звярнуў увагу, што крытыка з боку Захаду гучыць на адрас многіх краін, у тым ліку і Турцыі. Сам беларускі лідар зыходзіць з пазіцыі, што, калі вас пачынаюць крытыкаваць, ведайце, што вы робіце правільна. Калі крытыка неканструктыўная, то ўвагу на яе звяртаць не варта.

Пра беларускі брэнд

Палітыку міжнацыянальнага і міжканфесійнага міру кіраўнік дзяржавы назваў брэндам нашай краіны. Паводле яго слоў, пацвярджэннем гэтага ў тым ліку з'яўляецца адкрытая нядаўна ў Мінску мячэць.

Што беларускі лідар будзе абмяркоўваць на перагаворах з Эрдаганам?

Прэзідэнт расказаў, што візіт у Турцыю, які мае адбыцца, будзе ў асноўным прысвечаны развіццю гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння, інвестыцыйнаму супрацоўніцтву, таму што тут у нас пакуль не тыя аб'ёмы. Ён падкрэсліў, што Беларусь хоча мець з Турцыяй такія ж цёплыя і сяброўскія адносіны, як, напрыклад, з Расіяй.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў цёплыя, дружалюбныя міжасобасныя адносіны з турэцкім лідарам. «Мы называем адзін аднаго братам, гэта была ініцыятыва Рэджэпа Эрдагана. Я яго называю сваім сябрам. Па-рознаму. Але заўсёды як блізкія, можна нават сказаць, як родныя людзі», — дадаў ён.

Паводле БелТА.

Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь смуткуе ў сувязі са смерцю сябра Саюза пісьменнікаў Беларусі, краязнаўцы Івана Паўлавіча ЯРАШЭВІЧА і выказвае шчырае спачуванне родным і блізкім.

Класныя навіны

УНІКАЛЬНЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ ЮНЫХ ІНТЭЛЕКТУАЛАЎ

«Нацыянальны дзіцячы тэхнапарк — гэта якасна новая ўстанова адукацыі, скіраваная на выхаванне нацыянальнай інтэлектуальнай эліты», — такую думку выказаў падчас сустрэчы з журналістамі начальнік галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі Міністэрства адукацыі Сяргей КАСПЯРОВІЧ.

12 красавіка кіраўніком дзяржавы быў падпісаны ўказ аб стварэнні ў краіне Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. Плануецца, што ён пачне працаваць у сталіцы да 1 студзеня 2021 года. Штогод у тэхнапарку будзе праходзіць навучанне каля дзвюх тысяч найбольш адораных дзяцей — вучняў 6—11-х класаў з усіх рэгіёнаў краіны.

— Мы кажам пра стварэнне прынцыпова новай установы адукацыі з вельмі сур'ёзным кадравым забеспячэннем, з якасна новай матэрыяльна-тэхнічнай базай і новай адукацыйнай праграмай па рабоце з адоранай моладдзю, — падкрэсліў Сяргей Каспяровіч. — У аснову навучання будзе пакладзены праектны метад і міждысцыплінарны падыход. Школьнікі, адабраныя на аснове дастаткова жорсткіх крытэрыяў, будуць навучацца ў Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку на працягу 21 дня (адной змены, прысвечанай рэалізацыі канкрэтнага праекта), а затым будзе весціся іх дыстанцыйнае суправаджэнне — да таго моманту, пакуль яны зноў не трапяць на змену ў тэхнапарк. Мы разумеем: каб працаваць з адоранымі дзецьмі і моладдзю, неабходна прыцягваць самых таленавітых і адораных педагогаў. Для гэтага прадугледжаны адпаведныя матывацыйныя падыходы і асаблівыя падыходы ў плане аплаты працы, — паабяцаў Сяргей Каспяровіч. — Будуць прыцягвацца найлепшыя педагогі, якія працуюць ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, дадатковай адукацыі, настаўнікі-метадысты, універсітэцкія выкладчыкі, вучоныя Нацыянальнай акадэміі навук, спецыялісты, якія займаюцца ў арганізацыях і на прадпрыемствах канструктарскай дзейнасцю, забяспечваюць тэхналагічнае развіццё.

У Нацыянальным дзіцячым тэхнапарку створаць адпаведную вучэбна-лабараторную базу. Лабараторыі будуць забяспечваць пошукавую дзейнасць адоранай моладзі ў галіне бія- і інфармацыйных тэхналогій, касмічнай тэхнікі і шэрагу іншых кірункаў. На цяперашні момант прадугледжана не менш за 11 функцыянальных кірункаў, па якіх будуць праводзіцца даследаванні. Па меры з'яўлення новых прарыўных тэхналогій лабараторная база будзе ўдасканальвацца, каб не адстаць ад часу.

У інфраструктуру тэхнапарка, які размесціцца ў жылым комплексе «Магістр», увойдуць вучэбна-лабараторны корпус і інтэрнат для пражывання навучэнцаў, разлічаны на 300 чалавек. Пражыванне і харчаванне будуць забяспечвацца за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту.

Да таго ж у жылым комплексе «Магістр» плануецца ўзвесці школу на 750 месцаў: яна будзе забяспечваць як патрэбы жыхароў мікрараёна, так і патрэбы Нацыянальнага дзіцячага тэхнапарка. Яго выхаванцы змогуць навучацца ў школе па індывідуальных адукацыйных планах, каб не адстаць ад сваіх аднакласнікаў па школьнай праграме.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Надвор'е

РЭГІЁНЫ ПАТРАБУЮЦЬ ДАЖДЖУ

На думку сіноптыкаў, да чацвярга прыгрэе да плюс 17 градусаў

Першая палова красавіка характарызавалася дэфіцытам ападкаў. На гэтым тыдні па-ранейшаму будзе пераважаць антыцыкланальны характар надвор'я, так што будзе зноў без дажджоў. Толькі ў пачатку і ў канцы тыдня пад уплывам малаактыўных атмасферных франтоў месцамі не абыдзецца без невялікіх ападкаў, паведамілі спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.

А сёння ўдзень атмасферны фронт прынясе невялікія дажджы ў многія раёны Гомельскай і Брэсцкай абласцей і месцамі на астатняй тэрыторыі краіны. Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе 9—15 цяпла, а па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці — не вышэй за плюс 6—8 градусаў. У сераду пад уплывам перыферыі скандынаўскага антыцыклону будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 1 да плюс 5 градусаў, пры праясненнях паветра месцамі панізіцца да 3 марозу. Удзень будзе ад плюс 11 да плюс 16 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у чацвер будзе пераважна без ападкаў. Тэмпература паветра ўначы складзе ад мінус 3 да плюс 3 градусаў, а па паўднёвым захадзе — плюс 4—5 градусаў. Удзень па краіне будзе 11—17 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ЦЯПЕР І НА ГРАШАХ

Нацыянальны банк Рэспублікі Беларусь выпусціў у абарачэнне памятныя манеты «II Еўрапейскія гульні 2019 года. Мінск»:

залатую — наміналам 50 рублёў, масай 7,78 г, пробай сплаву 999, дыяметрам 25,00 мм, тыражом 300 штук;

сярэбраную — наміналам 20 рублёў, масай 33,63 г, пробай сплаву 925, дыяметрам 38,61 мм, тыражом 1500 штук;

медна-нікелевую — наміналам 1 рубель, масай 19,50 г, дыяметрам 37,00 мм, тыражом 3000 штук.

Манеты адчаканены ў ЗАТ «Літоўскі манетны двор» якасцю: залатая і сярэбраная — «пруф», медна-нікелевая — «пруф-лайк».

Выпушчаныя ў абарачэнне манеты з'яўляюцца законным плацежным сродкам Рэспублікі Беларусь, абавязковым да прыёму па намінальным кошце пры ўсіх відах плацяжоў без усялякіх абмежаванняў.

Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.

З шахты эвакуявалі людзей

Адбылося гэта пад Салігорскам — у рудніку другога рудаўпраўлення.

Тут з-за ўзгарання падземнага медпункта і задымлення горных вырабатак галоўных кірункаў гарызонту (445 метраў) давялося эвакуяваць людзей.

Пасля здарэння быў уведзены ў дзеянне план ліквідацыі аварыі па рудніку. Усіх работнікаў вывелі на паверхню. Горнавыратавальнікі ваенізаванага атрада прадпрыемства лакалізавалі і ліквідавалі ачаг узгарання. Вытворчы працэс не спыняўся. Ніхто не пацярпеў, паведамілі ў ААТ «Беларуськалій».

Сяргей РАСОЛЬКА.

Нашы

Беларускія дзюдаісты ў пагонах — найлепшыя

З 2007 года праводзіцца Сусветны турнір па дзюдо сярод паліцыі і арміі. Ён прысвечаны памяці супрацоўнікаў, якія загінулі пры выкананні службовага абавязку. Для паліцэйскіх, ваеннаслужачых і ратавальнікаў з многіх краін ён з'яўляецца адным з асноўных спартыўных мерапрыемстваў. Трынаццаты па ліку турнір застаўся за камандай МУС Беларусі.

— Гэтая перамога вельмі каштоўная яшчэ і таму, што наша каманда ўпершыню дамаглася чэмпіёнства, — расказаў **начальнік аддзела службовай падрыхтоўкі ўпраўлення прафесійнай падрыхтоўкі галоўнага ўпраўлення кадраў Міністэрства ўнутраных спраў Беларусі палкоўнік міліцыі Віктар ЯНЧУКОВІЧ.** — Да таго адзінаццаць разоў турнір выйгравалі расіяне і аднойчы вікторыю здабылі японцы. Але з мінулых спаборніцтваў нашы дзюдаісты прывозілі бронзавыя медалі, а летась узняліся на другую прыступку п'едэстала гонару.

Сёлета на базу палаца спорту «Дынама» ў Маскве з'ехаліся 14 камандаў з Беларусі, Расіі, Аўстрыі, Грэцыі, Японіі, Чэхіі і Літвы. На шляху да фіналу беларусы перайгралі зборныя паліцыі Літвы, Грэцыі і Японіі. У вырашальным паядынку ім супрацьстаяла інтэрнацыянальная зборная паліцэйскай асацыяцыі Расіі.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Палесціна папрасіла Расію дабіцца ад Ізраіля разблакіравання замарожаных сродкаў

Палесцінская нацыянальная адміністрацыя (ПНА) звярнулася да Расіі з просьбай аказаць ціск на Ізраіль для разблакіравання пераводаў фінансавых сродкаў на $138 млн, якія палесцінскія ўлады выплацілі ў якасці дапамогі сваякам палесцінскіх тэрарыстаў у 2018 годзе. Пра гэта паведамляе газета The Jerusalem Post.

Паводле яе звестак, прэм'ер-міністр Дзяржавы Палесціна Мухамед Штае «папрасіў РФ аказаць ціск на Ізраіль у дачыненні да скарачэння падатковых пераводаў». Падрабязнасцяў пра тое, у якім фармаце і каму накіраваны зварот, не прыводзіцца.

Ізраільскія ўлады ад імя ПНА збіраюць падаткі і пошліны і пераводзяць гэтыя сродкі назад, палесцінцам. Штомесячныя пераводы складаюць каля $100 млн. Гэтыя сродкі — адзін з асноўных даходных артыкулаў бюджэту Палесціны.

Па звестках ізраільскага мінабароны, ПНА траціць больш за $300 млн у год на дапамогу сем'ям палесцінцаў, якія адбываюць турэмныя тэрміны або якія загінулі падчас нападаў на ізраільцян. Такія выплаты, упэўнены ізраільскія ўлады, — прамы стымул да тэрарызму.

Кіраўнік МУС Украіны перасцярог штабы кандыдатаў у прэзідэнты ад распальвання нянавісці

Міністр унутраных спраў Украіны Арсен Авакаў лічыць, што выбары прэзідэнта ў краіне падзялілі грамадства на два непрымірымыя лагеры, а палітычная канкурэнцыя выйшла за рамкі здаровага сэнсу.

«У інфармацыйнай сферы грамадства падзелена на два непрымірымыя лагеры. І хто-ніхто лічыць, што тут усе сродкі добрыя. Прапагандысты ў патэтыцы сваёй агітацыйнай рыторыкі заяўляюць аб тым, што калі не пераможа іх пункт гледжання, то Украіна загіне», — заявіў міністр. Авакаў лічыць, што ў спробе зарабіць сабе палітычныя балы і большую падтрымку грамадзян удзельнікі выбарчага працэсу «ірвуць сваімі заклікамі краіну на часткі, не задумваючыся аб наступствах, атручваючы гневам украінскае грамадства». Кіраўнік ведамства асабліва падкрэсліў, што ў бок адыходзяць мудрасць, прыстойнасць і дабрыня, а на парадак дня выходзіць нянавісць.

«Дапамажыце свайму прэзідэнту — хто б ім ні стаў — ісці па правільным шляху. Не дазваляйце ўцягнуць сябе ў разбуральную канфрантацыю», — звярнуўся Авакаў да ўкраінцаў.

Лідар Косава лічыць магчымым пагадненне з Сербіяй у 2019 годзе

Пагадненне аб нармалізацыі адносін паміж Бялградам і Прышцінай можа быць заключана ў 2019 годзе. Пра гэта ў інтэрв'ю газеце The Guardian заявіў лідар непрызнанага Косава Хашым Тачы.

«Мы павінны сесці за стол перагавораў нават з нашымі заклятымі ворагамі, але без якіх-небудзь папярэдніх умоў, і паспрабаваць пачуць адзін аднаго», — заявіў Тачы. Кіраўнік непрызнанага Косава ўказаў на неабходнасць больш хуткага прагрэсу ў перагаворах з сербскім бокам. Па словах Тачы, нерашучасць міжнароднай супольнасці «стварае свабоду дзеянняў для нацыяналістаў і папулістаў па абодва бакі мяжы».

«Толькі мірнае пагадненне прынясе росквіт», — адзначыў лідар самаабвешчанага Косава. «Дэмаркацыя мяжы», на яго думку, будзе складовай часткай любога ўсёабдымнага пагаднення аб узаемным прызнанні». Аднак не можа быць падзелу паводле этнічнай прыкметы. Гэта немагчыма, і Косава, і Сербія застануцца шматэтнічнымі дзяржавамі», — сцвярджае Тачы.

Сталічны ЧАС

• Асобным катэгорыям грамадзян на рынках Мінска з красавіка даюць прэферэнцыі для рэалізацыі плодаагароднінай прадукцыі, паведамілі БелТА ў галоўным упраўленні спажывецкага рынку. Для пашырэння магчымасцяў рэалізацыі распрацавана электронная сістэма па браніраванні гандлёвых месцаў у гандлёвых радах і машына-месцаў на рынках. Усяго ў Мінску працуюць 22 рынкі, з якіх на 16 рэалізуецца вітамінная прадукцыя. Для гэтай мэты адведзена больш за 3 тысячы гандлёвых месцаў. У сезон масавых нарыхтовак фізічным асобам дадаткова выдзяляецца каля 1,5 тысячы месцаў. Прычым пенсіянерам і інвалідам пры рэалізацыі ўласнай прадукцыі даюцца льготы — з красавіка да снежня гэтая катэгорыя прадаўцоў можа не аплачваць выкарыстанне гандлёвых месцаў для рэалізацыі плодаагароднінай прадукцыі вагой да 20 кілаграмаў.

• Партал «Мой горад» 115.бел дапамог вырашыць ужо больш за 200 тысяч праблемных пытанняў жыхароў сталіцы, паведамілі карэспандэнту агенцтва «Мінск-Навіны» ў Цэнтры інфармацыйных тэхналогій Мінгарвыканкама. Любы карыстальнік можа адсачыць статус апублікаванага запыту і ацаніць вынікі работы, якую правялі камунальныя службы. Фотасправаздачы рэгулярна абнаўляюцца. Галоўная задача партала — спрасціць магчымасць узаемадзеяння службы ЖКГ з гараджанамі. І зрабіць дзейнасць кіраўнікоў кампаній празрыстай, адкрытай і даступнай. Як вядома, партал 115.бел запусцілі 1 лістапада 2015 года. За гэты час на інтэрнэт-рэсурсе зарэгістраваліся амаль 90 тысяч карыстальнікаў.

Не сезон

Забарона на лоўлю судака

З мэтай захавання папуляцыі судака і стварэння спрыяльных умоў для яго размнажэння, у тым ліку ў пераднераставы і паслянераставы перыяды, у рыбалоўных угоддзях Беларусі з 15 красавіка да 30 мая ўстанаўліваецца забарона на яго лоўлю. У выпадку ненаўмыснага вылаву судака рыбу неабходна адпусціць.

— За незаконнае выманне судака ў названы перыяд прадугледжана адміністрацыйная адказнасць з накладаннем штрафу ад 20 да 50 базавых велічынь, магчыма таксама канфіскацыя прылад лоўлі. Пры гэтым за кожную асобіну судака, злоўленую падчас забароны, прыйдзецца пакрыць прычыненую шкоду па трайной таксе — 18 базавых велічынь, або 441 рубель. Калі агульная сума шкоды складзе больш за 100 базавых велічынь, можа быць распачата крымінальная справа, — расказалі ў Дзяржаўнай інспекцыі аховы жывёльнага і раслiннага свету пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Трагедыя

Дзіця знайшлі. Нежывым

Бяда прыйшла ў шматдзетную сям'ю з вёскі Любашкі Камянецкага раёна, гэта недалёка ад Белавежскай пушчы. 13 красавіка маладая маці згубіла з вачэй амаль двухгадовае дзіця, думала, што ненадоўга. Гэта было апоўдні. А бліжэй да вечара яна не знайшла малога каля хаты, абзваніла сваякоў, у іх таксама не было Вані. Тады Алена Валошына патэлефанавала ў міліцыю.

Пошукі пачаліся ў гэты ж дзень. На наступны дзень у вёсцы ўжо было пад сотню чалавек, дзіця шукалі супрацоўнікі міліцыі, ратавальнікі, валанцёры. Праглядалі літаральна кожны дэцыметр зямлі, абследавалі кожную пабудову ў невялікім радыусе. Куды ж, здавалася, магло зайсці дзіця, якому толькі ў маі павінна было споўніцца два гады?

Аказалася, змагло. Хлопчыка знайшлі ў суботу прыкладна за паўтара кіламетра ад вёскі ў меліярацыйным канале.

— Паміж суседнімі вёскамі Любашкі і Галоўчыцы каля трох з паловай кіламетраў. Канал знаходзіцца на сярэдзіне поля, — расказаў **афіцыйны прадстаўнік Брэсцкага абласнога ўпраўлення УС Сяргей ДУЧАНКА.** — У Галоўчыцах жыве бабуля хлопчыка. На полі і каля канала былі толькі сляды дзіцяці, і ніякіх іншых. Таму найбольш верагоднай бачыцца версія няшчаснага выпадку. Але СК у рамках крымінальнай справы правярае ўсе версіі, высвятляе ўсе абставіны трагедыі.

Ваня рос у сям'і прадстаўнікоў этнічнай меншасці. Яго маці 18 гадоў, бацьку 20. Хлопчык быў трэцім дзіцем, самаму малодшаму няма і года.

Брэсцкае УСС выразіла падзяку ўсім нераўнадушным людзям, якія прыехалі на месца здарэння і шукалі дзіця некалькі сутак. І яшчэ раз заклікала не пакідаць дзяцей без нагляду.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

Чытач — газета

АД «ЗВЯЗДЫ»... ГАСПАДАРАМ...

Тупее слых,
Слабее зрок,
І галава ўжо не тая...
Але ж выпісваю «Звязду»!
Чытаю...

Прыкладна так пісаў пра сябе адзін з адданых сяброў газеты ў свае амаль 90!

Не ў памяці ўжо, ці дасылаў ён карткі на розыгрыш прызоў? Магчыма, і не. Але ж хто-ніхто па-ранейшаму, з квартала ў квартал, робіць гэта, каб потым было на што паспадзявацца, пачакаць, што пакажа розыгрыш, каб пасля яго цяжка ўздыхнуць (маўляў, зноўку міма!) альбо...

Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Гэта ўжо традыцыя: лёс звяздоўскіх прызоў вырашаюць зусім не звяздоўцы, — дзелавыя партнёры газеты, яе чытачы, то-бок госці. На гэты раз у канферэнц-зале газеты мелі шчасце прымаць арганізатара продажаў «Белсаюздрука» Наталлю Віктараўну Таўстыку і адданых падпісчыкаў «Звязды» мінчан Таццяну Віктараўну Камчыц і Міхаіла Барысавіча Шляхціна (*на здымку*). Менавіта яны (і, дарэчы, вельмі прыгожыя людзі!) з нашага чароўнага капелюша выцягвалі карткі шчасліўчыкаў. Такім чынам,

дрыль Bosch EasyImpact 500 выйгралі:

Аляксей Васілевіч Шчэрба, г. Кобрын Брэсцкай вобласці;

Сцяпан Сцяпанавіч Даргель, в. Воўкаўшчына Мёрскага раёна Віцебскай вобласці;

Ірына Віктараўна Дзянісенка, г. Гомель Гомельскай вобласці;

Чэслаў Станіслававіч Найловіч, в. Жалабы Шчучынскага раёна Гродзенскай вобласці;

Міхаіл Іванавіч Мірановіч, в. Мышкавічы Кіраўскага раёна Магілёўскай вобласці;

Віктар Уладзіміравіч Дзёмічаў, г. Клецк Мінскай вобласці;

Таццяна Іванаўна Цяцеркіна, г. Мінск.

Суперпрыз — універсальны набор інструментаў Yato — выйграла Аксана Уладзіміраўна Белікава, г. Мінск.

Віншуем шчасліўчыкаў!

Тым жа, каго ўдача (і, магчыма, зноў) абмінула, яшчэ раз скажам: не засмучайцеся. Выпісвайце «Звязду», прысылайце карткі на розыгрыш... Вам таксама пашанцуе!

Афіцыйна

Арганізатарам рэкламнай гульні «Звязда» — руплівым гаспадарам!» з'яўляецца рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда» (УНП 100155376), размешчаная па адрасе: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

Рэкламная гульня «Звязда» — руплівым гаспадарам!» зарэгістравана Міністэрствам гандлю Рэспублікі Беларусь 27.02.2019 г. (пасведчанне № 3495) і праводзіцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь з 7 сакавіка да 30 чэрвеня 2019 года ўключна сярод падпісчыкаў газеты «Звязда» на другі квартал або першае паўгоддзе 2019 года. Усяго ў гульні ўзялі ўдзел 158 падпісчыкаў. Прызавы фонд гульні разыграны цалкам.

Тэлефон для даведак па пытаннях правядзення рэкламнай гульні і атрымання прызоў: 8 (017) 263 66 73.

Новыя кнігі

Чэслаў Немен: жыццё як песня-лёс

Мінскае выдавецтва «Чатыры чвэрці» падаравала чытачу сапраўды ўнікальную кнігу.

Нагадаем: герой кнігі, ці, хутчэй, кнігі-фотаальбома альбо фотакнігі, — Чэслаў Немен, сапраўдныя імя і прозвішча якога Чэслаў Юліўш Выджыцкі. Вакаліст, кампазітар, мультыінструменталіст, аўтар тэкстаў. Уладальнік шасці залатых і аднаго плацінавага дыска. Нарадзіўся на Гародзеншчыне 16 лютага 1939 года. Пайшоў з жыцця 17 студзеня 2004 года. У яго амаль 65 гадоў умясцілася наўздзіў яркае, поўнае мастацкіх, музычных адкрыццяў жыццё. Словы самога музыканта: «Сваю песню Dziwny jest ten swiat я напісаў супраць крывадушных адносін паміж людзьмі, супраць інтрыг і пачуцця зайздрасці. Я разумеў, што як толькі заспяваю такую песню, то нешта зменіцца вакол мяне. Што людзі будуць узрушаны, як і я быў узрушаны сваёй песняй...» Чэславу было 19 гадоў, калі ў яго роднай вёсцы закрылі касцёл і бацька прыняў няпростае рашэнне пераехаць у Польшчу...

У кнізе няшмат інфармацыі пра музычнае, мастацкае станаўленне Немена як таленавітага музыканта. Пра гэта ўжо напісалі і яшчэ, пэўна, напішуць дзясяткі, а хутчэй за ўсё — сотні кніг. Выдадуць манаграфіі, а мо — і персанальныя энцыклапедыі. Таму ж, зразумела, і цікавасць да гэтага выдання ў большай ступені выклікана прывязанасцю аповеду да родных мясцін музыканта. Старыя Васілішкі, касцёл, частыя прыезды музыканта і кампазітара — тэма тэксту і багатага ілюстрацыйнага матэрыялу. У 1970-я гады наш суродзіч часта гастраляваў у розных гарадах Савецкага Саюза. У 1976 годзе музыкант даў інтэрв'ю беларускай журналістцы Веры Савінай. Фотаздымак, на якім адлюстравана яе гутарка з Неменам, быў падараваны дому-музею музыканта ў Старых Васілішках. Вера Савіна ў суаўтарстве з Аляксандрам Нілавым зняла дакументальны фільм «Гэты дзіўны свет...» (2009 год). Вера Савіна пры падтрымцы захопленых творчасцю польскага музыканта і кампазітара беларускага паходжання Віталя Раковіча і Аляксандра Амшэя і зрабіла кнігу «Чэслаў Немен», выдадзеную ў выдавецтве «Чатыры чвэрці». Вера Савіна, якая з'яўляецца аўтарам тэксту, — сцэнарыст больш як трыццаці дакументальных фільмаў, журналіст. Віталь Раковіч — фатограф, дызайнер. Ён — аўтар канцэпцыі фотакнігі, яе дызайну. Аляксандр Амшэй — начальнік аддзела турыстычнай і інвестыцыйнай дзейнасці ўпраўлення эканомікі Шчучынскага райвыканкама. Ён з'яўляецца кансультантам, рэдактарам выдання.

Літаральна кожная старонка кнігі «Чэслаў Немен» — пранікненне ў свет музычнага мастацтва, адкрыццё крынічных вытокаў вялікага таленту.

Кастусь ЛАДУЦЬКА.

БАНКАЎСКАЯ КАРТКА І РАХУНАК СОТАВАГА: ДВА Ў АДНЫМ

МТС і банк Дабрабыт прэзентавалі прадукт для безнаяўных разлікаў

Магчымасць карыстацца пластыкавай карткай, грошы на якой «прывязаны» не да банкаўскага рахунку, а да балансу мабільнага тэлефона, неўзабаве з'явіцца ў абанентаў МТС. Інавацыйны прадукт створаны мабільным аператарам МТС, банкам Дабрабыт і Mastercard. Карткай можна аплачваць тавары, камунальныя паслугі, разлічвацца ў кафэ і здымаць з яе наяўныя. Разлічваючыся па картцы «МТС Грошы», можна тым самым атрымаць да 10 % кэшбэку на паслугі сотавай сувязі.

Картку можна таксама падключаць да сэрвісу Samsung Pay і разлічвацца на касе, дакранаючыся мабільным да тэрмінала. МТС Грошы — добрае рашэнне для дзіцяці ці бацькоў-пенсіянераў, запэўнілі стваральнікі ўнікальнай распрацоўкі, прэзентуючы яе падчас выстаўкі «ТІБО-2019».

Аляксандр ВАЛАДЗЬКО — намеснік старшыні праўлення банка Дабрабыт.

— Гэта карысны і зручны прадукт, які па сваіх тэхнічных якасцях не саступае стандартнай банкаўскай пластыкавай картцы. З яго дапамогай можна здзяйсняць усе аперацыі, даступныя трымальнікам банкаўскіх картак. Карыстацца ёю за мяжой, пераводзіць грошы праз інтэрнэт і тэрміналы, — адзначыў **Аляксандр ВАЛАДЗЬКО, намеснік старшыні праўлення банка Дабрабыт.**

Акрамя таго, сродкі на картцы можна папаўняць, пераводзіць іх на іншыя карткі, атрымліваць СМС-апавяшчэнні пра рух грошай і адсочваць баланс у рэжыме рэальнага часу ў праграме «МТС Грошы».

— Прадукт атрымаўся вельмі няпростым тэхналагічна, і гэта адна з яго асноўных вартасцяў. Яшчэ адзін важны момант — праграма лаяльнасці, якая будзе матываваць кліентаў здзяйсняць яшчэ больш плацяжоў у зручным і бяспечным фармаце, — пракаментаваў **Вадзім ГАЛОЎЧЫЦ, віцэ-прэзідэнт міжнароднай плацёжнай сістэмы Mastercard у Беларусі.**

На фота справа налева — Старшыня Праўлення банка Дабрабыт Ігар ЛІХАГРУД, Генеральны дырэктар МТС Уладзімір КАРПОВІЧ, глава Прадстаўніцтва Mastercard у Беларусі Вадзім ГАЛОЎЧЫЦ.

Пры гэтым перавод грошай на рахунак будзе адбывацца без камісій, проста праз папаўненне балансу нумара тэлефона.

— Мы стартуем з паняццем «бясплатная сувязь», — заявіў **Дзяніс ЦЯРЭШЧАНКА, кіраўнік дэпартамента маркетынгу МТС.** *— Грошы, якія кліент безнаяўным спосабам траціць па картцы, вяртаюцца ў выглядзе кэшбэку, звычайную банкаўскую, аднак гэта ўсё ж рэзервовы спосаб разлікаў, кажуць стваральнікі новага сродку. Хаця гэта зусім новае рашэнне ў Беларусі, з часам картка, як плануецца, папоўніцца новымі сэрвісамі.*

— Вялікая колькасць нашых абанентаў прысутнічае ў інтэрнэце, і вельмі важна, каб ім было зручна здзяйсняць усё, што неабходна, у гэтым віртуальным асяроддзі. Літаральна ў маі з'явяцца першыя ўладальнікі нумароў МТС, якія змогуць афарміць такую бескантактавую картку, — мяркуе **Уладзімір КАРПОВІЧ, генеральны дырэктар кампаніі МТС.** — *Неімянныя карткі будуць выдавацца на тры гады ў салонах сувязі тэлекамаператара. Заказаць яе можна таксама праз праграму «МТС Грошы».*

За ўсімі тэхналогіямі павінен быць сэнс, і ён у зручнасці. Мы аб'ядналі ў адзін прадукт дзве зразумелыя рэчы: банкаўскую картку і мабільны тэлефон. Аднак за кожным рашэннем стаіць вельмі складаная сістэма, кажуць стваральнікі карткі. Яе выпуск і абслугоўванне будуць бясплатнымі, як і плацяжы па картцы, аднак трэба памятаць, што, напрыклад, за здыманне наяўных, выкарыстанне мабільнага і інтэрнэт-банкінгу будзе брацца камісія.

Ірына СІДАРОК, Вераніка ХІЛЬКЕВІЧ, фота Андрэя САЗОНАВА.

Дзяніс ЦЯРЭШЧАНКА — кіраўнік дэпартамента маркетынгу МТС.

СОЮЗ ЕВРАЗИЯ

№ 7 (115) Вторник, 16 апреля 2019 года

Для читателей Беларуси, России, Казахстана, Армении, Кыргызстана

Выходит 2 раза в месяц

Издается с 26 апреля 2014 года

ИМЕННО с этого начала свое приветственное слово участникам тематической сессии министр Евразийской экономической комиссии Карине МИНАСЯН. Проекты цифровой повестки Евразийского экономического союза обсуждали на полях второго Евразийского цифрового форума, который уже традиционно прошел на площадке XXVI Международного форума по информационно-коммуникационным технологиям «ТИБО-2019» в Минске.

ЦИФРОВАЯ ПОВЕСТКА ЕАЭС: МЫ ОПАЗДЫВАЕМ!

Передовые технологии доставки на стенде РУП «Белпочта» на выставке «ТИБО-2019».

Фото Татьяны ТКАЧЕВОЙ.

«Хотелось бы сегодня только один важный тезис подчеркнуть: мы должны ускоряться. Больше года мы про цифровую повестку дня союза говорим, проводим научно-исследовательские работы, обсуждаем, но давно настало время переходить от принятия решений к реализации проектов. Мы опаздываем и можем не успеть использовать возможности интеграции», — сказала член Коллегии (министр) по внутренним рынкам, информатизации, информационно-коммуникационным технологиям ЕЭК Карине Минасян.

С этим тезисом полностью согласился и **министр связи и информатизации Беларуси Константин ШУЛЬГАН**: «Действительно обидно, что, имея потенциал, проекты, которые могут успешно реализоваться на площадях не только одного государства, но и евразийского содружества, мы тормозим... Надо перестать бояться ошибок. Надо научиться слышать друг друга, учитывать интересы каждого и находить решение, которое позволит проектам двигаться». Белорусский министр заметил, что проектов много, и предложил начать с тех, которые интересны всем государствам-участникам и уже в каком-то из них реализуются.

(Окончание на 2-й стр. «СЕ».)

ИНФОРМАЦИОННЫЕ ТЕХНОЛОГИИ ДИКТУЮТ ЗАКОНЫ

Белорусские компании готовы вступить в единый цифровой рынок ЕАЭС

Специальный датчик информирует о заполнении мусорного контейнера и, соответственно, корректирует маршрут спецтехники, ошейник отслеживает движения коровы и отправляет сообщение на телефон о ее приходе в охоту, роботизированный самосвал управляется дистанционно, а почтовая марка становится электронной — с этими и другими новинками белорусских производителей группа депутатов Палаты представителей ознакомилась во время выездного заседания по вопросам развития телекоммуникационной отрасли.

Посетив молочнотоварную ферму «Таборы» агрокомбината «Ждановичи», международный форум информационно-коммуникационных технологий «ТИБО-2019», Республиканский центр обработки данных, депутаты убедились, что, например, точное земледелие — это даже не ближайшее будущее. Это уже сегодня. И это те животноводческие, охранные, ресурсосберегающие технологии, которые могут пользоваться спросом не только в Беларуси, но и за рубежом.

Технологии подобны воздуху — для них сложно установить границы. На территории Евразийского экономического союза идет речь о создании единого цифрового рынка, ведь логичнее объединяться, а не конкурировать. «Момент кооперации сложен, но, например, в России создали реестр производителей программного обеспечения для госнужд и приглашают всех членов «пятерки». Для «своих» предусмотрены преференции, а заказы могут быть многомиллионными», — рассуждает **член Постоянной комиссии по промышленности, топливно-энергетическому комплексу, транспорту и связи Андрей ЮНИЦЫН**.

Ярким примером экспорта информационно-коммуникационных технологий депутат считает Парк высоких технологий. В ПВТ «обкатываются» преференции и льготы, и на эти уникальные условия привлекаются компании из других стран. А профессионалы из Беларуси остаются в стране, зарабатывают и тратят деньги здесь же. С начала года в ПВТ прибавилось еще около 50 компаний, экспорт парка за прошлый год превысил миллиард четыреста миллионов долларов. «Теперь этот режим надо распространять на всю Республику Беларусь, на другие отрасли экономики, в том числе в реальном секторе. Это единственный верный путь, и чем быстрее мы это осознаем, тем эффективнее сможем развивать производство», — уверен Андрей Юницын.

Развитие информационных технологий должно благотворно влиять не только на экономику, но и на социальную, гуманитарную сферы. «Прогресс освобождает время для саморазвития, образования, общения с семьей. Наша главная задача — научиться не просто быстро подстраивать законодательство под развитие ИТ, а где-то и на опережение работать. В противном случае мы просто не сможем применять новации в жизни», — подчеркивает **заместитель председателя Постоянной комиссии по законодательству Максим МИСЬКО**, напоминая о революционном (не только для Беларуси, для всего ЕАЭС) Декрете № 8 «О развитии цифровой экономики».

Но, с одной стороны, страна идет к сети 5G, а с другой — поступают жалобы избирателей на качество мобильной связи, за городом иногда нет покрытия. «Общение со специалистами, как, например, на этом выездном заседании, помогает депутатам уяснить все тонкости, чтобы потом сформировать четкие нормы. В новой версии закона «Об электросвязи» нам нужно найти баланс между всеми заинтересованными, отталкиваясь от потребностей граждан», — подчеркивает **председатель Постоянной комиссии по промышленности, топливно-энергетическому комплексу, транспорту и связи Андрей РЫБАК**.

Сегодня борьба за потребителя все больше уходит в виртуальное пространство. «Пусть в этой конкуренции победит сильнейший, и выиграет от этого гражданин», — подвела итог совместного заседания **председатель Постоянной комиссии по законодательству Наталья ГУЙВИК**.

В наши дни практически каждый закон Республики Беларусь так или иначе касается телекоммуникационных технологий: ни ЖКХ, ни транспорт, ни платежные системы не обходятся без них. В данный момент в Палате представителей находится на рассмотрении проект совершенно нового закона — о персональных данных.

Варвара МОРОЗОВА.

ПРОЗРАЧНОСТЬ БЕЗ ПРИНУЖДЕНИЯ

Россия предлагает обязательную маркировку табачных изделий и лекарств

Первого июля Российская Федерация вводит обязательную маркировку обуви. Беларусь предложила провести пилотный проект по маркировке обуви на территории ЕАЭС среди заинтересованных государств на основе эксперимента в РФ.

Кроме того, Россия уже внесла предложение о введении обязательной маркировки в отношении табачных изделий, лекарственных препаратов и обувных товаров на территории всего союза. «Наконец начался период прозрачных переговоров, а то бизнес в России был поставлен перед фактом», — отметили предприниматели на XXII заседании Бизнес-диалога с представителями предпринимательского сообщества государств — членов Евразийского экономического союза.

Традиционный Бизнес-диалог состоялся в Евразийской экономической комиссии в Москве, представители стран — участниц ЕАЭС пообщались посредством видеоконференции. В частности, Казахстан подтвердил заинтересованность в проекте. При этом, как отметила белорусская сторона, всей пятерке необходимо выработать общие подходы. Россия, в свою очередь, призывает учитывать при таких глобальных изменениях интересы малого и среднего бизнеса.

Эксперты подчеркивают: благодаря введению маркировки меховых изделий «теневой» рынок «обелился» в восемь раз — при прогнозных двух. В Армении эксперимент оказался настолько экономически эффективным, что средство идентификации стало бесплатным.

Во время Бизнес-диалога обсудили выявление и устранение препятствий на внутреннем рынке ЕАЭС. В прошедшем году констатировано устранение десяти барьеров: в том числе касающихся выдачи паспортов транспортных средств, введения запретов на поставки из Беларуси молочной продукции, разных ставок НДС в Кыргызстане, субсидий на покупку в России спецодежды.

Среди главных препятствий актуальными остаются вопросы электронной цифровой подписи и допуска к государственным закупкам, обращение Армении по сертификации средств связи.

Согласно дорожной карте, утвержденной межправительственным советом, об устранении 17 изъятий и ограничений на 2017—2019 годы, подготовлено соглашение и часть подзаконных актов о селекционно-племенной работе, вступило в силу соглашение по обращению семян сельскохозяйственных растений и принято пять подзаконных актов, в высокой степени готовности соглашение по признанию пробирных клейм.

Ведутся переговоры по признанию водительских удостоверений, выданных в Армении, в России; обсуждаются изменения договора по возврату НДС и признание банковских гарантий при госзакупках.

Решаются и вопросы технического регулирования: сегодня требования 68 нормативных правовых актов государств — членов союза отличаются от техрегламентов ЕАЭС. «Национальные обязательные требования должны быть отменены со дня окончания переходных периодов к единым техрегламентам», — подчеркнули в Департаменте функционирования внутренних рынков Евразийской экономической комиссии.

Варвара МОРОЗОВА.

❍ В тему

Национальная маркировка отдельных групп товаров функционирует в Беларуси с марта 2005 года. Этот механизм учета товаров отечественного и импортного производства введен для контроля и предотвращения вовлечения в незаконный оборот товаров.

По информации **заместителя председателя Государственного таможенного комитета Александра БОГДЕВИЧА**, в 2017 году таможенные органы Республики Беларусь завершили 83 административных процесса по фактам незаконной реализации на территории страны изделий из меха и обуви. В 2018 году таких нарушений выявлено на 12 % меньше — 73 административных процесса. За первый квартал 2019 года пресечено уже 28 подобных фактов.

Вчера, 15 апреля, в Беларуси начался пилотный проект по маркировке обуви, классифицируемой кодами 6401—6405 единой Товарной номенклатуры ВЭД ЕАЭС, средствами идентификации (уникальная последовательность символов в машиночитаемой форме, представленная в виде штрихового кода или с использованием иного средства (технологии) автоматической идентификации).

ЦИФРОВАЯ ПОВЕСТКА ЕАЭС: МЫ ОПАЗДЫВАЕМ!

Две свободы из четырех

На этот раз в Минске обсуждали цифровые проекты ЕАЭС в трех сферах: транспортные коридоры, промышленная кооперация и трудоустройство. Две первые еще год назад были отнесены к числу приоритетных. И если в промышленной кооперации, по словам Карине Минасян, «этот процесс сам начал жить своей жизнью», то обсуждение транспортных коридоров показало, что разработчики модели и бизнес порой по-разному видят даже проблемы, которые должны в итоге решаться. А между тем эта сфера обеспечивает две из четырех (товары, услуги, капитал и рабочая сила) декларируемых свобод союза: общий рынок услуг и товаров.

Казалось бы, все очевидно: чем быстрее перемещается груз от поставщика к потребителю, тем он дешевле и в ряде случаев — качественнее. **Представитель Аналитического центра при правительстве Российской Федерации Максим ГАЛЛ** считает, что общей проблемой и для организаторов перевозок, и для исполнителей, и для государственных органов (пограничники, таможня, контролеры) является отсутствие той или иной актуальной информации (загруженность, пропускная способность, маршрут). «Основная причина — отсутствие взаимодействия между сервисами на уровне планирования и осуществления перевозки», — убежден он. И предлагает создать это взаимодействие в качестве еще одной государственной услуги.

(Окончание. Начало на 1-й стр. «СЕ».)

Фото Татьяны ТКАЧЕВОЙ.

Однако участники сессии заметили, что это приведет к увеличению и без того немалых бюрократических издержек для бизнеса и станет дополнительным негативным сигналом для инвесторов.

«У нас нет проблемы с доступностью актуальной информации, — говорили представители бизнеса. — У нас есть проблемы с постоянно меняющимися условиями. То есть если мы загрузили грузовик и, например, весовые параметры в одной стране считаются по одному алгоритму, а в другой — по-другому. Если вы хотите предложить нам новые сервисы, где будет информация про загруженность контрольно-пропускных пунктов, то спасибо, не надо! Мы узнаем об этом непосредственно на сайтах госорганов в режиме онлайн».

Евразийская электронная биржа труда

